Коммуникация в социально-гуманитарном знании, экономике, образовании : материалы III Международной научно-практической конференции, 29-31 марта 2012 г., Минск / Белорусский государственный университет. — Минск, 2012. — С. 399-400.

3. Смаргович, И. Л. Актуальные проблемы исследования культурно-досуговой деятельности / И. Л. Смаргович // Культура Беларуси: реалии современности: XI Международная научно-практическая конференция (Минск, 13 октября 2022 г.): сборник научных статей / Белорусский государственный университет культуры и искусств. — Минск, 2022. — С. 226-229.

4. Фаблинова, О.Н. Возможности и последствия проведения досуга посредством использования Интернет-технологий/ О.Н.Фаблинова// Социологический альманах. — 2012. — №3. — С.345-355.

Картавцов М.Д., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Колобова И.Н.,
кандидат исторических наук, доцент

## ШКОЛЬНЫ ТЭАТР НА БЕЛАРУСІ Ў XVI–XVIII СТСТ.

Актуальнасць абранай тэмы вызначаецца пашырэннем цікавасці грамадства да вывучэння гісторыі сваёй краіны ў шматлікіх напрамках яе развіцця, напрыклад: грамадска-палітычным, прамысловым, культурным, мастацкім. Цікавай старонкай развіцця культуры Беларусі ў XVI–XVIII стст. з’яўляецца гісторыя тэатральнай дзейнасці.

Мэта дадзенай работы – на прыкладзе школьнага тэатра даследаваць асноўныя аспекты пачатковага этапа станаўлення беларускага тэатра.

Пры разглядзе ўзгаданай тэмы выкарыстоўваліся даследаванні шэрагу беларускіх навукоўцаў. Аднак фактычны матэрыял па гэтаму перыяду развіцця тэатра вельмі разрознены і не сістэматызаваны.

У манаграфіі Ф. Аляхновіча «Беларускі тэатр» праводзіцца агульны агляд гісторыі станаўлення беларускага тэатра ад народнага да прафесійнага яго ўзроўню. М. Гарэцкі ў даследаванні, прысвечаным гісторыі беларускай літаратуры ад старажытных часоў да пачатку XX ст., звяртаў сваю ўвагу і на развіццё тэатральнай творчасці.

Шмат інфармацыі аб гісторыі школьнага тэатру было знойдзена ў працах беларускага літаратуразнаўца А. Мальдзіса, які ў манаграфіях «На скрыжаванні славянскіх традыцый» і «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі», разглядае шматлікія пласты культурнага жыцця на беларускіх землях.

Непасрэднай тэматыцы школьнага тэатра прысвечаны навуковыя артыкулы даследчыкаў А. Пагоцкай і Г. Ігнацьевай.

Значнай падзеяй у беларускай культуры XVI–XVIII стст. стала з'яўленне і развіццё адной з першых формаў тэатральных відовішчаў – школьнага тэатру. Сваім узнікненнем, ён абавязаны манаскаму ордэну езуітаў. Цалкам гісторыя школьнага тэатру ахоплівае перыяд ад 1571 па 1773 гг. [5, с. 24].

Езуіты прыбылі ў Рэч Паспалітую ў 1569 г., праз год у Вільні быў заснаваны першы на землях Вялікага Княства Літоўскага езуіцкі калегіум, які ў 1579 г. стаў акадэміяй на правах універсітэта. На тэрыторыі Беларусі першы калегіум быў заснаваны ў 1581 г. у Полацку.

Езуіты, жадаючы паўплываць на насельніцтва, ладзяць тэатральныя пастаноўкі. Усяго на землях Рэчы Паспалітай існавала 29 езуіцкіх тэатраў. Менавіта дзякуючы езуітам, школьны тэатр атрымаў свой найбольшы распаўсюд на нашых землях у XVI–XVIII стст. [5, с. 24].

Першыя пастаноўкі адбываліся ў калегіумах, што былі размешчаны ў Пінску (1662), Навагрудку (1671), Мінску (1692), Слуцку (1715), Нясвіжы і Полацку (1723), Віцебску (1766), Слоніме (1769) [5, с. 24].

Захаваліся звесткі і аб тэатрах іншых каталіцкіх ордэнаў, пратэстантаў і праваслаўных брацтваў. Пратэстанты ладзілі свае паказы ў Слуцку (1686), піярскія тэатры ў 60–70-я гг. XVIII ст. дзейнічалі ў Віцебску і Лідзе Тэатральныя трупы складаліся са здольных да акцёрскага майстэрства навучэнцаў калегіумаў. Яны праходзілі курс спецыяльнага навучання дэкламацыі, паводзінаў на сцэне, атрымлівалі дадатковую практыку карыстання лацінскай мовай і інш. Пры выконванні жаночых роляў выкарыстоўваліся адпаведныя маскі і адзенне. Пастаноўкі мелі абавязковае харавое суправаджэнне, дэкарацыі і асвятленне.

Акрамя чыста дыдактычных спектаклі мелі і забаўляльныя мэты і прыўрочваліся да рэлігійных, або народных святаў, а таксама праводзіліся, як своеасаблівая справаздача, з нагоды сканчэння навучальнага года.

Па прыкладзе езуітаў у некаторых праваслаўных школах таксама пачалі ставіць камедыі, якія пісаліся выкладчыкамі рыторыкі. З XVIII ст. да нашых дзён дайшлі дзве з’явы «камедыі», галоўным героем якіх выступаў беларускі селянін, падобны на сялян з езуіцкіх твораў [1, с. 57].

Асноўным рэпертуарам школьных тэатраў былі духоўныя драмы, якія з’явіліся ў сярэднявечнай Еўропе, а пазней ператварыліся ў цэльныя драматычныя творы – містэрыі, што паказвалі сцэны на Біблейскія матывы. Акрамя містэрый былі драмы, дзе дзеючымі асобамі былі такія абстрактныя паняцці як дабрадзейства і злачынства. Гэтыя драмы мелі назву маралітэ, або міракль, і паказвалі жыцці святых і цуды, якія яны здзейснілі [3, с. 50].

Містэрыі, якія ў Еўропе звычайна адбываліся ў цэрквах, на беларускіх землях ставіліся менавіта вучнямі ў калегіумах [3, с. 52].

Таксама папулярны былі камедыйныя сюжэты, якія браліся з Біблейскіх паданняў, або свецкай гісторыі (звычайна грэчаскай альбо рымскай). Часта камедыя была звязана з народным тэатрам, а часам і з італьянскай камедыяй масак (дэль артэ) [6, с. 119].

На сцэне школьнага тэатру таксама ставілісь класічныя еўрапейскія трагедыі, якія мелі свецкі характар. Прыкладамі падобнага з’яўляюцца п’есы

П’ера Карнэля «Сід» і «Атон», «Гафолія» Жана Расіна, «Заіра» і «Альзіра» Вальтэра [6, с. 119].

Мова твораў езуіцкага тэатру ў Беларусі звычайна была лацінская. Але такія яе часткі як пралог, хор, эпілог ствараліся на зразумелай народу беларускай мове. Таксама па-беларуску пісаліся інтэрмедыі – невялічкія жывыя сцэнкі, асновай якіх былі розныя смешныя гісторыі ці проста народны побыт. Звычайна яны мелі сатырычную накіраванасць і гралі ролю дадатку да асноўнага твору [5, с. 28].

Спачатку езуіты забаранялі падобныя ўстаўкі, але пазней сталі дапускаць іх і нават мноства падобных твораў уключылі ў свае падручнікі [5, с. 29]. Да нашых дзён з часоў эпохі барока дайшло каля 20-ці інтэрмедый. Звычайна ў такіх сцэнках на беларускай мове размаўлялі ніжэйшыя па статусу прадстаўнікі грамадства: сяляне, рамеснікі, слугі і габрэі. Шляхта жа размаўляла па-польску, што адлюстроўвала моўны падзел тагачаснага грамадства [4, с. 162].

Самым знакамітым зборам беларускіх сцэнічных твораў з’яўляецца «Аршанскі кодэкс», які быў створаны ў Аршанскім езуіцкім калегіуме. Лічыцца, што ён быў напісаны да 1693 г. Зборнік утрымлівае ў сябе 4 барочных польскамоўных драмы і 7 інтэрмедый да іх. Імаверна гэта адзіны зборнік, які захаваўся да нашага часу, бо падобныя выданні існавалі і ў іншых калегіумах, але былі страчаны. Сёння «Аршанскі кодэкс» знаходзіцца па-за межамі Беларусі ў бібліятэцы імя Асалінскіх, што размешчана ў г. Вроцлаве (Польшча) [3].

Ужо ў XVIII ст. пачалі з’яўляцца інтэрмедыі на чыстай беларускай мове.

Самым вядомым творам таго часу стала п’еса манаха-дамініканца Каятана Марашэўскага «Камедыя», напісаная па-беларуску і па-польску, але не гледзячы на дзвюхмоўнасць твора, большая яго частка створана менавіта на жывой беларускай мове. Упершыню «Камедыя» была пастаўлена ў 1787 г. у Забельскім дамініканскім калегіуме.

Ужо к канцу XVIII ст. школьныя тэатры прыходзяць да свайго заняпаду. Гэта звязана з закрыццём езуіцкіх калегіумаў і адпаведным спыненнем тэатральных паказаў. Пастаноўкі працягвалі ладзіцца толькі ў вышэй згаданым Забельскім калегіуме. Але разам з гэтым свой росквіт атрымлівае ўжо іншы від тэатру – прыдворны [5, с. 259–260].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што школьны тэатр – адна з важных вехаў у гісторыі беларускага тэатральнага мастацтва, якая стала пераходнай ад народнага тэатру да прафесійнага. Неабходна таксама падкрэсліць, што гэтая з’ява паўплывала на развіццё беларускай мовы і літаратуры перыяду XVI–XVIII стст.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Аляхновіч, Ф. К. Беларускі тэатр / Ф. К. Аляхновіч. – Вільня: Выданне беларускага грамадзянскага сабрання ў Вільні, 1924. – 119 с.

2. Гарэцкі, М. І. Гісторыя беларускае літаратуры / М. І. Гарэцкі. – Вільня: Таварыства друк, 1920. – 208 с.

3. Ігнацьева, Г. Аршанскі езуіцкі калегіум / Г. Ігнацьева [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/28132. – Дата доступу 20.02.2023

4. Мальдзіс, А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.

5. Мальдзіс, А. І. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 479 с.

6. Пагоцкая, А. В. Школьныя тэатры на Беларусі (канец XVI – XVIII стст.) / А. В. Пагоцкая // XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры: матэрыялы чытанняў, Мінск, 21–24 мая 2009 г. – Мінск, 2010. – С. 118–122.